*Бабіч Т.М. (Беларусь, г.Мінск)*

# РЭПРЭЗЕНТАЦЫЯ ТРАДЫЦЫЙНАГА ІНСТРУМЕНТАРЫЮ БЕЛАРУСАЎ У ДЗЕЙНАСЦІ МУЗЕЯ-ЛАБАРАТОРЫІ БЕЛАРУСКІХ НАРОДНЫХ МУЗЫЧНЫХ ІНСТРУМЕНТАЎ БДУКМ

Навукова-творчая лабараторыя-музей беларускіх народных музычных інструментаў (НТЛ БНМІ) УА «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» пачаў сваю пленную дзейнасць у канцы 1990-х гадоў з ініцыятывы славутага музыканта, нацыянальна-культурнага дзеяча, даследчыка, стваральніка і кіраўніка ансамбляў «Крупіцкія музыкі» і «Гуды» (БДУКМ) Уладзіміра Мікалаевіча Грома (1951 - 2006). Аснову экспазіцыі створанага ўніверсітэцкага музея музычных інструментаў склалі інструменты з уласнага фонду У.М. Грома.

Дзейнасць музея была накіравана на захаванне і навуковае вывучэнне традыцыйнага беларускага інструментарыю. Паспяховае функцыянаванне музея, здзяйснёныя навуковыя і адукацыйныя праекты сумесна з выкладчыкамі кафедры беларускіх народных духавых інструментаў сталі магчымымі дзякуючы стварэнню пры ўніверсітэце своеасаблівага цэнтра па вывучэнні народнай інструментальнай музыкі, з часам рэарганізаванага ў Навукова-творчую лабараторыю беларускіх народных музычных інструментаў (з 2005 г. загадчык Л.А. Густова-Рунцо) - даследчы цэнтр, у які ўвайшлі вядомыя музыканты, аўтарытэтныя спецыялісты ў галіне інструментазнаўства і маладыя навукоўцы. У розныя часы тут працавалі У. Гром, І. Мангушаў, А. Крамко, В. Кульпін, Л. Густова-Рунцо (з 2005 г.), Т. Бабіч (з 2008 г.), А. Боганева, Т. Варфаламеева (з 2009 г.), А. Сурба, Р. Маленчанка (з 2010 г.).

Праца сучаснай НТЛ БНМ1 складаецца з навуковых і экспедыцыйных даследаванняў, вышукальніцкай дзейнасці з мэтай фарміравання дакладнай рэсурснай базы, важнейшай этнаінструментазнаўчай інфармацыі, а таксама з кабінетнай аналітычнай работы, звязанай з апрацоўкай матэрыялаў. Паступова з актыўнымі працэсамі збірання музычных фондаў, вывучэння і сістэматызацыі музычных матэрыялаў прыярытэтнае значэнне надавалася менавіта навуковай і навукова-метадычнай дзейнасці.

Для любой навучальнай установы, у якой сістэматычна здзяйсняецца даследаванне народнай творчасці, арганізацыя дадзенага навукова-даследчага цэнтра з'яўляецца неабходнай перадумовай паслядоўнай і плённай працы. Так, менавіта ў дзеючай НТЛ даецца магчымасць не толькі шматбакова тэарэтычна вывучаць музычны фальклор, але і праводзіць практычныя даследаванні: распрацоўваць рэпертуарныя зборнікі, дапаможнікі, набываць музычныя інструменты, архіўіраваць найноўшыя аўтэнтычныя матэрыялы (аўдыёвізуальнае дакументаванне), захоўваючы іх у архіве аўдыёзапісаў і пісьмовай дакументацыі. Такая работа накіравана на далейшае навуковае даследаванне, і, у першую чаргу, на тыражыраванне дыскаў з запісамі, публікацыю інструментальных зборнікаў.

На працягу апошняга дзесяцігодцзя былі выдадзены падручнікі: «Школа ігры на беларускіх народных духавых інструментах» (Ч. 1 «Сольнае выканальніцтва»; Ч. 2 «Ансамблевае выканальніцтва») У. Грома. А. Крамко, І. Мангушава. зборнік твораў для беларускіх народных духавых інструментаў «Музычная скарбонка» І. Мангушава. канцэртныя творы для беларускіх народных духавых інструментаў «Грай, мая дудка!» і вучэбны дапаможнік «Беларускія народныя духавыя інструменты» А. Крамко, «Першапачатковая школа ігры на дудцы» У. Грома. А. Крамко. І. Мангушава.

С гэтага часу вывучэнне музычнай інструментальнай народнай творчасці- выйшла ў навучальнай установе на новы якасны і навуковы ўзровень. Так. у 2007 г. выходзіць серыя

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

мультымедыйных каталогаў і электронных падручнікаў, распрацаваных творчым калектывам (У.М. Гром, Л.А. Густова-Рунцо, А.Я. Крамко, І.А. Мангушаў, Т.М. Бабіч, Я.Д. Грыгаровіч). У першым электронным падручніку «Беларускія народныя духавыя інструменты» (у 2 ч.) змяшчаецца характарыстыка беларускіх народных духавых інструментаў (канструкцыйныя і мастацкія асаблівасці, аплікатура. строй і дыяпазон дыятанічных аўтэнтычных і мадэрнізаваных храматычных духавых інструментаў, дадаюцца нотныя прыклады беларускіх народных песенных і танцавальных мелодый): свістковых (дудка, парная дудка, поршневая дудка, акарына), язычковых (жалейка, дуда, саломка), амбушурных (труба, рог). Распрацаваны даследчыкамі і музыкантамі электронны каталог «Узоры народна- інструментальнай спадчыны беларусаў» (у 3 ч.) змяшчае прыклады найгышаў (пастухоўскія, сігнальныя, песенныя, танцавальныя) на духавых народных І негру ментах у выкананні У. Грома. І. Мангушава. А. Крамко. а таксама мастацкія ўзоры (апрацоўкі народных мелодый, арыгінальныя аўтарскія творы І.Мангушава. А.Крамко для духавых народных інструментаў) з сучаснага канцэртнага рэпертуару ансамбляў «Крупіцкія музыкі» і «Гуды», Нацыянальнага акадэмічнага народнага аркестра Беларусі імя І. Жыновіча.

Лёс музея, заснаванага вядомым калекцыянерам. навукоўцам. музыкам У.М. Громам, склаўся шчасліва. Яго праца была працягнута і знайшла пераемнікаў. Развіваючы напрацоўкі свайго папярэдніка. сучасныя даследчыкі дапасуюць намаганні да распрацоўкі новых тэм і праектаў у галіне народнага музычна-інструментальнага мастацтва. На практыцы сутнасць усіх гэтых намаганняў рэалізуецца наступным чынам.

У 2009 - 2010 гг. НТЛ распрацоўвала тэму «Беларускае вяселле» (сцэнарый з музычным дадаткам) на матэрыяле цэнтральнай часткі Беларусі. У 2010 г. пачаўся навуковы праект - стварэнне і аўдыёзапіс шэрагу музычных казак для дзяцей «Грай, музыка!». У казках апавядаецца пра прыгоды народных музыкаў, гісторыі музычных інструментаў. сярод якіх - скрыпка, жалейка, дудка, цымбалы. Казкі былі складзены і запісаны народнай артысткай Беларусі Рымай Фёдараўнай Маленчанка. Паралельна завяршаецца фундаменальная праца па ставарэнні ілюстраванага падручніка «Традыцыйныя музычныя духавыя інструменты беларусаў» для навучэнцаў дзіцячых музычных школ і школ мастацтваў (аўтары У. Гром. Л. Густова-Рунцо, Т. Бабіч).

На базе музея НТЛ БНМІ праводзяцца лекцыйныя заняткі па курсах «Музычныя інструменты Беларусі», «Народна-інструментальнае мастацтва Беларусі», «Традыцыйныя мастацтвы» і іншыя для студэнтаў ВДУКМ. Супрацоўнікі музея праводзяць экскурсіі-знаёмствы з традыцыйнай інструментальнай культурай Беларусі для навучэнцаў, студэнтаў, гасцей і міжнародных дэлегацый універсітэта.

НТЛ БНМІ вядзе актыўную навукова-практычную дзейнасць. Сумесна з кафедрай этналогіі і фальклору БДУКМ арганізуе штогод (з 2007 г.) міжнародную навукова-практычную канферэнцыю «Аўтэнтычны фальклор: праблемы вывучэння, захавання, пераймання». У канферэнцыі прымаюць удзел вядучыя спецыялісты ў галіне этналогіі, этнафоназнаўства, інструментазнаўцы, фалькларысты, музыканты, маладыя даследчыкі з Беларусі, краін СНД і далёкага замежжа. На канферэнцыі агучваюцца актуальныя пытанні, прысвечаныя праблемам пераемнасці, захавання і вывучэння аўтэнтычнага фальклору - спеўнага, інструментальнага, вусна-паэтычнага. У межах канферэнцыі ладзяцца фестывалі этнічнай музыкі з удзелам этнаграфічных калектываў розных рэгіёнаў Беларусі, гуртоў-пераемнікаў фальклорных традыцый (так званыя «постфальклорныя гурты») і інш. Па выніках работы канферэнцыі выдаецца зборнік навуковых прац удзельнікаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Каштоўную частку нашага архіва складаюць экспедыцыйныя фота- і відэаматэрыялы, а таксама фоназапісы, якія паступаюць з прыватных збораў. У апошнія гады ў музей НТЈ1 БНМІ паступілі фота і відэафіксацыі з фестываляў «Берагіня» (2008, 2010), «Фальклор беларускай глыбінкі» (2007 - 2010), «Звіняць цымбалы і гармонік» (2008, 2010), прыватныя запісы, перададзеныя сям'ёй Громаў, Жукоўскіх і інш.

Унікальная калекцыя традыцыйных беларускіх музычных інструментаў сабрана ў экспазіцыі музея. Кожны з іх пазначаны нумарам, мае адпаведныя звесткі: сігнатура збору, прозвішча майстра ці ўладальніка, канструкцыйнае апісанне і інш. Традыцыйны музычны інструмент беларусаў - дзіўная з'ява, што вырасла на глебе як матэрыяльнай, так і духоўнай культуры этнасу. Матэрыяльная культура шмат у чым вызначыла форму, матэрыял, спосаб вырабу і асаблівасці аздаблення музычных інструментаў. Духоўная культура з яе разнастайнымі мастацкімі праявамі (вуснапаэтычнай, вакальна-песеннай, музычна-інструментальнай, харэаграфічнай), самабытнай сістэмай нацыянальна адметных вобразаў і сродкаў выразнасці, ідэалам прыгажосці абумовіла з'яўленне прыдатных для іх увасаблення асаблівых музычна-гукавых прылад. Усе інструменты-экспанаты музея рэпрэзентаваны па секцыях у адпаведнасці з прынятай класіфікацыяй музычных інструментаў: струнныя, духавыя, мембранныя і самагучальныя. Састаў нашых інструментаў вельмі разнастайны і шматлікі. Інструменты характарызуюцца ў адпаведнасці з асаблівасцямі канструкцыі і гучання, спосабамі вырабу і аздаблення, спецыфікай бытавання, рэпэртуарам і інш.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ





РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ





Духавыя народныя музычныя інструменты з калекцыі НТЛ БНМІ БДУКМ

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Сучасны фонд музея складаюць музычныя інструменты і прыстасаваныя да музычнай дзейнасці хатнія прылады (лыжкі, рубель, жбаночкі, чыгуны), храдыцыйныя народныя вясковыя і гарадскія інструменты, аўтэнтычныя і мадэрнізаваныя, дыятанічныя і храматычныя. майстравыя і фабрычныя (усяго больш за 100 адзінак). Самыя старажытныя з іх адносяцца да сярэдзіны XIX ст. Гэта струнны шчыпковы інструмент цытра (нямецкай фабрыкі) і фісгармонія (інструменты з прыватнай калекцыі сямЧ Громаў). У фондах музея захоўваецца шматлікая калекцыя струнных інструментаў: скрыпкі, альт, басэтля майстроў В. Пратасевіча, У. Жукоўскага, колавая ліра А. Жукоўскага, фабрычныя - нямецкая (плоская) і неапалітанская (выпуклая) - мандаліны, балалайка, гітара, майстравыя цымбалы. Група духавых музычных інструментах у беларусаў самая вялікая і разнастайная. Яна ўключае інструменты як простыя па сваёй канструкцыі, так і складаныя, інструменты, узятыя з прыроды ці зробленыя народнымі майстрамі або нават фабрычныя (кларнет, труба, валторна і інш.). Духавыя інструменты адрозніваюцца формай, памерамі, строем, матэрыялам вырабу (дрэва метал, костка і скура жывёл і інш.). Усе яны маюць асаблівыя акустычна-гукавыя якасці, выканальніцкія магчымасці, а таксама адпаведныя функцыі. Цікавая і разнастайная музейная экспазіцыя з духавых інструментаў. Гэта дуды майстроў У. Грома В. Кульпіна і А. Сурбы, акарыны Д. Грома, дудкі, жалейкі, саломкі, чароткі У. Грома і В. Кульпіна шматлікія свісцёлкі. Асобна экспануюцца духавыя язычковы інструменты - гармонікі («хромкі», «венкі»), акардэоны.

У беларускім музычным інструментарыі група самагучальных (ударна- шумавых) інструментаў вылучаецца развітасцю і разнароднасцю, разнастайнасцю канструкцый, форм, матэрыялаў, спосабу вырабу, гукавых магчымасцей, прызначэння і функцый у жыцці народа. Безумоўна, тэмбрава-гукавы спектр традыцыйнага інструментарыю беларусаў значна збяднее, калі выключыць з яго такія гукавыя эфекты, як «шум», «звон», «стук», «трэск», «шамаценне», «клёкат», «бразгат». Значную колькасць экспанатаў-артэфактаў фонду НТЛ складаюць менавіта такія экспанаты. Гэта не толькі традыцыйныя музычныя інструменты, але і хатнія рэчы, забаўляльныя прылады, дзіцячыя цацкі, якія з даўніх часоў выкарыстоўвалі нашы продкі ў магічных дзеяннях, царкоўнай службе, народных святах і г.д. Таму калекцыя нашага музея з такіх інструментаў шматлікая і выклікае асобую зацікаўленасць у яго наведвальнікаў. Гэта драўляныя кляшчоткі, трашчоткі, калатушкі, каробачкі, рагулькі, металічныя званочкі, падкоўкі, шархуны. талеркі, вугольнікі, варганы, а таксама хатнія прылады (рубель, чыгуны, лыжкі і каса) і нават расліны («баршчавік» - зроблены з атрутнай расліны і зерня, гук якога нагадвае шум дажджа). На жаль, група ўдарных інструментаў з барабана і бубна прадстаўлена даволі сціпла.

Супрацоўнікамі музея-лабараторыі зроблена апісанне і класіфікацыя інструментарыю фонду НТЛ БНМІ ў адпаведнасці з персаналіямі майстроў, музыкаў і іншых дзеячоў беларускай культуры, з імёнамі якіх яны звязаны. Гэта будзе карысным для далейшай працы беларускіх даследчыкаў-інструментазнаўцаў, фальклярыстаў, гісторыкаў, вывучэння і ўвядзення інструментаў у навуковы і грамадскі ўжытак.

Артэфакты музея, медыйныя дакументы, выдадзеныя артыкулы. рэпертуарныя зборнікі супрацоўнікаў НТЛ БНМІ сведчаць аб сур'ёзнай фундаментальнай навукова-даследчай дзейнасці. Музычны фонд НТЛ БНМІ Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў з'яўляецца вынікам збіральніцкай працы беларускіх навукоўцаў, выкладчыкаў, маладых вучоных і аматараў народнай творчасці на працягу некалькіх дзесяцігодцзяў. Разумеючы каштоўнасць гэтых матэрыялаў і экспанатаў для гісторыі і даследавання беларускай інструментальнай культуры, музей НТЛ збірае іх у сваіх фондах.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Такім чынам, шматгранная і ўніверсальная дзейнасць НТЛ БНМІ ў той ці іншай ступені ўвасоблена не толькі ў экспазіцыйна-выставачнай, але і ў навукова- творчай, вычэбна-метадычнай рабоце. Своеасаблівай формай спасціжэння традыцыйнай культурнай спадчыны роднага краю з'яўляюцца апрадмечаныя і адухаўлёныя ў музейным асяродку гісторыка-культурныя каштоўнасці. У калекцыях з унікальных артэфактаў, якія захоўваюцца ў ім, адлюстраваны цэласны самабытны культурны пласт беларускай нацыі і задача музея сёння - рэпрэзентаваць яго ўсімі магчымымі музейнымі сродкамі, забяспечыць якасную і паўнацэнную фіксацыю і выкарыстанне не толькі ў музейнай, але і ў адукацыйна-выхаваўчай і навукова-творчай дзейнасці.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ







У. Гром і яго калекцыя музычных інструментаў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ